УДК 94(476)

А. Г. КАХАНОЎСКІ

# САЦЫЯЛЬНАЯ МАБІЛЬНАСЦЬ НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX – ПАЧАТКУ XX ст. У АДЛЮСТРАВАННІ БЕЛАРУСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

Дан анализ состояния и определены перспективы изучения белорусскими историками эволюции социальной мобильности населения Беларуси во второй половине XIX – начале XX в. Обращено внимание на значимость данной проблемы для понимания трансформации белорусского общества на этапе его перехода от традиционного к индустриальному уровню развития. Показано, что исследователи преимущественно косвенно и фрагментарно касались изучения форм и динамики социальной мобильности населения Беларуси. Охарактеризованы работы отечественных историков начиная с 1920-х гг., где нашли отражение различные аспекты указанной научной проблемы. Сделан вывод о том, что в белорусской историографии достаточно поверхностно отражены процессы интеграции социальной структуры населения Беларуси в сословно-корпоративную организацию российского общества после вхождения в состав Российской империи.

***Ключевые слова:*** социальная мобильность; население Беларуси; историография; сословная иерархия.

The article deals with the state and prospects of the study of the evolution of the Belarusian population social mobility in the second half of the XIX – beginning of the XX century by the Belarusian historians. The author pays attention to the importance of the problem for the understanding of the transformation of the Belarusian society in the period of the transition from the traditional to the industrial level of development. Mostly the researchers touched the forms and dynamics of the social mobility of the Belarusian population implicitly and fragmentarily. The article characterizes the works of the Belarusian historians written in the 1920s and onwards where the different aspects of the problem are shown. The author concludes that Belarusian historiography depicts the processes of the integration of the Belarusian population into the estates of the Russian society after partitions of the Polish-Lithuanian Commonwealth rather superficially.

***Key words:*** social mobility; Belarusian population; historiography; estates hierarchy.

Важнае месца ў вывучэнні трансфармацыйных працэсаў у беларускім грамадстве другой паловы XIX – пачатку XX ст. займаюць пытанні сацыяльнай мабільнасці насельніцтва – пераходу чалавека з аднаго саслоўя, класа ў іншы, з адной унутрысаслоўнай, унутрыкласавай групы ў другую, сацыяльных перамяшчэнняў паміж пакаленнямі і інш. Усе сацыяльныя перамяшчэнні асобы ці сацыяльнай групы ахоплівае працэс мабільнасці. Ва ўмовах Беларусі абазначанага часу да сацыяльнай мабільнасці можна аднесці тэрытарыяльныя перамяшчэнні прадстаўнікоў сацыяльных груп, пераход з адной сацыяльна-прафесійнай групы ў другую. Даступнасць, выбар шляхоў сацыяльнай мабільнасці залежаць ад высілкаў індывіда ці пэўнай групы людзей, але ў другой палове XIX – пачатку XX ст. вызначаліся ў вялікай ступені структурай грамадства, вызначанымі ім межамі і ролямі. Сацыяльная мабільнасць – гэта механізм, з дапамогай якога фарміруецца сацыяльная структура грамадства, а сацыяльная дыферэнцыяцыя ўяўляе сабой вынік працэсаў сацыяльнай мабільнасці. У той жа час магчымасць сацыяльнай мабільнасці ўмацоўвала стабільнасць грамадства. Актывізацыя і ўскладненне форм сацыяльнага жыцця ў апошнія дзесяцігоддзі XIX – пачатку XX ст. патрабавалі пашырэння шляхоў і ўцягнення ў працэсы сацыяльнай мабільнасці ўсіх груп насельніцтва.

Навуковая актуальнасць вывучэння эвалюцыі сацыяльнай мабільнасці насельніцтва для аналізу працэсаў трансфармацыі беларускага грамадства ў другой палове XIX – пачатку XX ст. падмацоўваецца нераспрацаванасцю праблемы ў айчыннай гістарыяграфіі. Такая праблема ў якасці самастойнага прадмета вывучэння фактычна не ставілася беларускімі гісторыкамі.

Не звяртаючыся да тэрміналогіі тэорыі сацыяльнай мабільнасці, беларускія даследчыкі пачалі распрацоўваць асобныя аспекты вызначанай праблемы ці блізкія да яе пытанні з 1920-х гг. У гэты час адным з галоўных прыярытэтаў даследаванняў гісторыкаў стала вывучэнне развіцця беларускай вёскі. Асноўны акцэнт быў зроблены на аналізе працэсаў сацыяльнага разлажэння сялянства, сацыяльных перамяшчэнняў унутры яго, вызначэння крытэрыяў дадзеных працэсаў. Гэтаму перыяду ўласціва празмерная ўвага да характарыстыкі ступені развіцця капіталістычных адносін і іх уплыву на эвалюцыю сельскай гаспадаркі. М. В. Доўнар-Запольскі ўпершыню ў беларускай гістарыяграфіі даў сістэмны аналіз сацыяльна-эканамічных працэсаў у Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. ва ўзаемадачыненні розных іх складнікаў [1]. Вызначаючы галоўную тэндэнцыю змен беларускага грамадства – развіццё пад уплывам капіталістычных адносін, даследчык значнае месца адвёў аналізу сацыяльна-дэмаграфічных працэсаў, вызначэнню сацыяльна-маёмасных працэсаў сярод сялянства. Адным з першых да гісторыі Беларусі паслярэформеннага перыяду звярнуўся У. Ігнатоўскі, які падкрэсліваў, што «Беларусь амаль не ведае тыпу рускага кулака міраеда, які як павук аплятаў усё сяло даўгавымі абавязкамі» [2, с. 17]. Заможны селянін у Беларусі заўсёды займаўся выключна земляробствам. Яму чужыя заняткі промысламі, гандлем і ліхвярствам. К. Кернажыцкі таксама звяртаўся да праблемы сацыяльнага разлажэння беларускага сялянства [3]. А. Смоліч коратка ахарактарызаваў асноўныя кірункі міграцыі насельніцтва Беларусі, узровень яго пісьменнасці, структуру заняткаў і нацыянальны склад [4].

У даследаваннях 1930–50-х гг. быў пашыраны разгляд пытанняў сацыяльнага разлажэння сялянства. Адным з першых беларускіх даследчыкаў, хто акцэнтаваў увагу на сацыяльнай неаднароднасці сялянства, быў Д. А. Дудкоў [5]. Для беларускай савецкай гістарыяграфіі асэнсаванне сацыяльных

працэсаў у Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст., у прыватнасці мабільнасці мясцовага грамадства, з'яўлялася ілюстрацыйным прыдаткам разгляду працэсаў сацыяльна-эканамічнага развіцця і разгортвання рэвалюцыйнага руху. У пэўным сэнсе шчаслівым выключэннем было вывучэнне працэсаў маёмаснага разлажэння беларускага сялянства і гісторыя рабочага класа. Асноўныя тэзісы таго часу: паступовае, няўхільнае разбурэнне і згаленне асноўнай масы сялянскіх гаспадарак, пралетарызацыя вясковай беднаты і пераўтварэнне невялікай часткі гаспадароў у сельскую буржуазію. Дадзены тэзіс бярэ пачатак у працах расійскіх эканамістаў і публіцыстаў народніцкага кірунку і ў значнай ступені транслірyецца ў асноўнай частцы сучасных беларускіх даследаванняў і ў навучальнай літаратуры. Нельга цалкам яго адкінуць нават з умовай новага прачытання крыніц і прымянення сучасных метадалагічных прыёмаў, аднак ён часам дастаткова схематычна адлюстроўвае складаную сацыяльную палітру беларускай вёскі перыяду капіталізму. Значнае месца ў даследаваннях К. І. Шабуні займала пытанне аб маёмасным разлажэнні беларускага сялянства пад уплывам развіцця капіталістычных адносін [6]. Аналіз крытэрыяў і сацыяльна-маёмаснага разлажэння сялянства прысутнічае ў большасці даследаванняў В. П. Панюціча [7, 8], у тым ліку і ў выдадзеным пад яго рэдакцыяй другім томе «Гісторыі сялянства Беларусі» [9]. Да пытанняў фарміравання сялянскай буржуазіі, уплыву капіталістычных адносін на беларускую вёску, вызначэння этапаў дадзенага працэсу звяртаўся таксама Х. Ю. Бейлькін [10]. Даследчык адносіць да ліку фермерскіх усе заможныя сялянскія гаспадаркі, дзе выкарыстоўвалася наёмная рабочая сіла. Акрамя таго, фермерамі, на думку Х. Ю. Бейлькіна, з'яўляліся тыя з заможных гаспадароў, якія не займаліся гандлёва-ліхвярскімі аперацыямі, але вялі сваю гаспадарку з выкарыстаннем працы наёмных работнікаў з мэтай атрымання прыбытку і былі цесна звязаны з рынкам. В. П. Панюціч не лічыць фермерства прыкметнай сацыяльнай з'явай у беларускай вёсцы другой паловы XIX – пачатку XX ст. Такую ролю ён адводзіць кулакам, да ліку якіх адносіць тых, хто вёў гаспадарку галоўным чынам пры дапамозе наёмнай рабочай сілы, але адначасова займаўся пасрэдніцкім гандлем, ліхвярствам [11, с. 57]. У. М. Міхнюк падкрэсліваў адсутнасць у беларускіх даследчыкаў адзінай методыкі вызначэння глыбіні сацыяльнага разлажэння сялянства [12, с. 26, 42–43]. П. Д. Верашчагін ускосна закранаў уплыў міграцый сялянства на яго сацыяльную мабільнасць, аднак перавялічваў удзельную вагу выхадцаў з беларускіх губерняў у агульнарасійскім перасяленчым руху [13, с. 4]. Перасяленні сялян Беларусі ў Сібір у пачатку XX ст., іх прычыны, памеры, уплыў на сацыяльныя працэсы сталі прадметам разгляду ў артыкулах З. М. Сямейных [14].

У працах М. В. Біча дадзены разгляд крыніц фарміравання пралетарыяту, а таксама кароткая характарыстыка дынамікі саслоўнага і сацыяльна-прафесійнага складу насельніцтва Беларусі ў другой палове XIX ст., аналіз працэсаў кансалідацыі як сацыяльнай групы буржуазіі [15]. У даследаваннях М. Ф. Болбаса таксама знайшлі адлюстраванне пытанні дынамікі росту і структуры рабочага класа, станаўлення буржуазіі Беларусі [16]. Асобныя пытанні сацыяльнай мабільнасці рабочых Беларусі знайшлі адлюстраванне ў працах Л. С. Бараноўскага, В. М. Іванова і інш. [17, 18]. Саслоўная ўрадавая палітыка ў другой палове XIX ст., рэжым выключных законаў у дачыненні да католікаў, яўрэяў, сферы землеўладання і землекарыстання, іх уплыў на сацыяльныя працэсы, змены ў саслоўна-прававым становішчы асобных груп насельніцтва Беларусі прааналізаваны ў даследаваннях С. М. Самбук [19].

У беларускай гістарычнай літаратуры на розных этапах сустракаліся неадназначныя ацэнкі ўзроўню пашырэння пісьменнасці, валодання граматай насельніцтвам Беларусі як аднаго з важнейшых фактараў яго сацыяльнай мабільнасці. Доўгі час пераважаў павярхоўны аналіз, неабгрунтаваныя і часта значна заніжаныя лічбы, што часткова было выклікана сцвярджэннем тэзіса аб каланіяльным мінулым Беларусі як былой адсталай ускраіны Расійскай імперыі. Першым грунтоўным даследаваннем названай праблемы стаў артыкул М. М. Улашчыка, апублікаваны ў 1968 г. [20]. Даследчык правёў вялікую работу па апрацоўцы статыстычных матэрыялаў канца XIX – пачатку XX ст., асабліва апублікаваных матэрыялаў перапісу насельніцтва 1897 г. Прыведзеныя М. М. Улашчыкам абагульняючыя лічбы аб узроўні пісьменнасці насельніцтва Беларусі канца XIX – пачатку XX ст. трывала ўвайшлі ў навуковы зварот большасці пазнейшых даследчыкаў і знайшлі адлюстраванне ў шэрагу навуковых прац і навучальных дапаможнікаў [21, 23]. У асобных публікацыях [24, с. 337] выкарыстоўваліся сумарныя даныя, якія заснаваны на не зусім карэктных падліках.

Упершыню агульныя абрысы сацыяльнай мадэлі беларускага гандлёва-прамысловага насельніцтва вызначыў З. В. Шыбека [25]. Уводзячы ў характарыстыку сацыяльнага складу беларускага насельніцтва такую катэгорыю, як прамежкавы клас, даследчык фактычна ўключае ў яго межы дробных уласнікаў і вытворцаў, якія без выкарыстання вольнанаёмных работнікаў сваёй працай здабывалі неабходныя сродкі існавання. У манаграфіі «Гарады Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX стагоддзяў)» З. В. Шыбека ўпершыню ў беларускай гістарыяграфіі закрануў праблему сацыяльнай і тэрытарыяльнай мабільнасці жыхароў беларускіх гарадоў і мястэчак, ахарактарызаваў палітыку расійскага ўрада ў дачыненні да працэсаў горадаўтварэння [26].

У апошнія дзесяцігоддзі сярод беларускіх даследчыкаў дастаткова папулярнымі сталі пытанні вывучэння гісторыі дваранства, буржуазіі, чыноўніцтва, святарства, інтэлігенцыі Беларусі і інш. Даследаванне А. П. Жытко «Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861–1914 гг.» з'яўляецца першай у айчыннай

гістарыяграфіі манаграфіяй, прысвечанай гісторыі вышэйшага саслоўя ў Беларусі на этапе станаўлення і развіцця капіталістычных адносін [27]. У матэрыяле даецца аналіз дынамікі складу дваранства, крыніц яго папаўнення. Н. І. Палятаева, абапіраючыся пераважна на даныя па Віцебскай і Мінскай губернях, прыйшла да высновы, што асноўнай крыніцай папаўнення шэрагаў купецтва было мяшчанства [28, с. 55]. Яна ж прааналізавала суадносіны паняццяў «купец», «купецтва», «прадпрымальнікі» прымяняльна да сацыяльна-прававой рэчаіснасці Расійскай імперыі другой паловы XIX – пачатку XX ст. [29]. Этапы і асаблівасці разгортвання працэсаў сацыяльнай мабільнасці ў Беларусі, іх змест і формы, уплыў на эвалюцыю сацыяльнай структуры насельніцтва ў другой палове XIX – пачатку XX ст. даследуе А. Г. Каханоўскі [30–32]. Эвалюцыю сацыяльна-групавога складу дробнай шляхты Беларусі ў сярэдзіне XIX ст., пытанні «разбору шляхты» вывучае В. С. Макарэвіч [33], сацыяльную стратыфікацыю сялянства Беларусі ў другой палове XIX ст. – Г. І. Маскевіч [34], месца маргінальных груп у сацыяльным складзе насельніцтва Беларусі вызначанага часу – В. В. Кныш [35]. На фоне сацыяльна-культурных змен у беларускай вёсцы ў другой палове XIX – пачатку XX ст. мабільнасць сялянства, яго сацыяльна-маёмасную іерархію прааналізаваў С. М. Токць [36].

Адной з форм сацыяльнай мабільнасці былі пераходы з каталіцтва ў праваслаўе. Многіх пераводзілі прымусова, але былі шматлікія выпадкі змены канфесійнай прыналежнасці праз магчымасць атрымання розных праў і прывілей эканамічнага характару. Пераходзілі не толькі сяляне, але і дваране, землеўласнікі, чыноўнікі. Пераходам з каталіцтва ў праваслаўе можна было павысіць свой сацыяльны статус, пазбавіцца многіх абмежаванняў, якія дзейнічалі ў дачыненні да прадстаўнікоў каталіцкага веравызнання і яўрэяў, якія часам прымалі хрысціянства. Міжканфесійныя пераходы ў другой палове XIX – пачатку XX ст. разгледжаны ў работах В. В. Яноўскай, А. І. Ганчара і інш. [37, 38].

У айчыннай гістарыяграфіі дастаткова павярхоўна адлюстраваны працэсы інтэграцыі сацыяльнай структуры насельніцтва беларускіх зямель пасля ўваходжання ў склад Расійскай імперыі ў саслоўна-карпаратыўную арганізацыю расійскага грамадства, прычыны захавання за каталіцкай і спаланізаванай землеўласніцкай элітай значных эканамічных і сацыяльна-культурных пазіцый, лёс «прамежкавых» сацыяльных катэгорый насельніцтва Беларусі (вольныя людзі, чыншавікі і інш.), якія не ўкладваліся ў жорсткую саслоўную іерархію грамадства Расійскай імперыі. Вынікам працэсаў маргіналізацыі, сыходнай сацыяльнай мабільнасці з'яўляецца стварэнне слоя сацыяльных паўпераў – сацыяльнага дна. Яго вывучэнне ў беларускай гістарыяграфіі толькі пачынаецца. Міжсаслоўная мабільнасць вельмі часта была звязана з тэрытарыяльнай. Характар гэтай узаемасувязі быў абумоўлены зменамі ў рыначнай кан'юнктуры, кірункам урбанізацыйных працэсаў і пакуль што вельмі пункцірна абазначаны ў беларускай гістарыяграфіі. На працягу другой паловы XIX – пачатку XX ст. выразна пашыраецца колькасць форм сацыяльнай мабільнасці. Можна назіраць параўнальныя змены сацыяльнага статусу ў прадстаўнікоў розных пакаленняў. У апошнія дзесяцігоддзі XIX – пачатку XX ст. больш заўважнымі становяцца працэсы ўнутрыпакаленнай мабільнасці. Дадзеныя пытанні таксама з'яўляюцца перспектыўнымі для вывучэння гісторыкаў. Да іх ліку адносіцца вызначэнне дынамікі і інтэнсіўнасці між- і ўнутрысаслоўных пераходаў, механізмаў практычнай рэалізацыі ўрадавых мерапрыемстваў па рэгуляванні сацыяльных пераходаў, ступені эфектыўнасці іх абмежавальных норм і г. д. У адрозненне ад вывучэння сацыяльнай мабільнасці сацыёлагамі, якія маюць магчымасць сфарміраваць даныя ў адпаведнасці з пастаўленай задачай, гісторыкам у праекцыі на пэўную адлегласць у часе даводзіцца мець справу з той інфармацыяй, якая ёсць у крыніцах і часта характарызуе сацыяльную мабільнасць ускосна і фрагментарна.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС


1. *Довнар-Запольский М. В.* Народное хозяйство Белоруссии. 1861–1914 гг. Минск, 1926.
2. *Игнатовский В.* Белоруссия. Территория, население, экономика и важнейшие моменты истории. 2-е изд. Минск, 1925.
3. *Кернажыцкі К. І.* Да гісторыі аграрнага руху на Беларусі перад імперыялістычнай вайной. Мінск, 1932.
4. *Смоліч А.* Географія Беларусі. 4-е выд. Менск, 1993.
5. *Дудкоў Д. А.* Аб развіцці капіталізму ў Беларусі ў 2-й палове XIX і пачатку XX стагоддзя. Мінск, 1932.
6. *Шабуня К. И.* Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции 1905–1907 гг. Минск, 1962.
7. *Панютич В. П.* Из истории формирования пролетариата Белоруссии (1861–1914 гг.). Минск, 1969.
8. *Панютич В. П.* Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1861–1900 гг. Минск, 1990.
9. Гісторыя сялянства Беларусі : у 3 т. / рэдкал.: М. С. Сташкевіч [і інш.]. Мінск, 1997–2002. Т. 2 : Ад рэформы 1861 г. да сакавіка 1917 г. / З. Е. Абезгауз [і інш.] ; пад рэд. В. П. Панюціча. 2002.
10. *Бейлькін Х. Ю.* Да пытання аб фермерах і кулаках на Беларусі (другая палова XIX – пачатак XX ст.) // Беларус. гіст. часоп. 1994. № 4. С. 70–76.
11. *Панюціч В. П.* Да ацэнкі некаторых праблем аграрнай гісторыі Беларусі перыяду капіталізму // Беларус. гіст. часоп. 1997. № 3. С. 51–57.
12. *Михнюк В. Н.* Крестьянство Белоруссии на пути к социализму: историографический очерк. Минск, 1979.
13. *Верещагин П. Д.* Крестьянские переселения из Белоруссии (вторая половина XIX в.). Минск, 1978.
14. *Сямейных З. М.* Міграцыя беларускага сялянства ў гады сталыпінскай аграрнай рэформы (1906–1914 гг.) // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1982. № 4. С. 53–59.
15. *Бич М. О.* Рабочее движение в Белоруссии 1861–1904 гг. Минск, 1983.
16. *Болбас М. Ф.* Промышленность Белоруссии. 1860–1900 гг. Минск, 1978.
17. *Бараноўскі Л. С.* Дэмаграфічная характарыстыка рабочых Гомельскіх майстэрань Лібава-Роменскай чыгункі (канец XIX – пачатак XX ст.) // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1973. № 4. С. 108–115.

18. *Иванов В. М.* Очерк быта промышленных рабочих дореволюционной Белоруссии. Минск, 1971.
19. *Самбук С. М.* Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX в. Минск, 1980.
20. *Улащик Н. Н.* Грамотность в дореволюционной Белоруссии // История СССР. 1968. № 1. С. 106–116.
21. Гісторыя Беларускай ССР : у 5 т. / рэдкал.: І. М. Ігнаценка (старш.) [і інш.]. Мінск, 1972–1975. Т. 2 : Беларусь у перыяд капіталізму (1861–1917 гг.) / К. І. Шабуня [і інш.]. 1972.
22. *Снапкоўская С. В.* Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX стст. Мінск, 1998.
23. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск, 2000–2006. Т. 4 : Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М. Біч [і інш.]. 2005.
24. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: са старажытных часоў да 1917 г. / М. А. Ткачоў [і інш.] ; пад рэд. М. А. Лазарука [і інш.]. Мінск, 1985.
25. *Шыбека З. В.* Сацыяльнае размежаванне беларусаў у канцы XIX ст. // Весці АН БССР. Сер. грамад. навук. 1991. № 6. С. 65–72.
26. *Шыбека З. В.* Гарады Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX стагоддзяў). Мінск, 1997.
27. *Жытко А. П.* Дваранства Беларусі перыяду капіталізму. 1861–1914 гг. Мінск, 2003.
28. *Полетаева Н. И.* Купечество Беларуси: 60-е гг. XIX – начало XX в. Минск, 2004.
29. *Полетаева Н.* Термины «купец – купечество – предприниматели» в курсе «Экономическая история Беларуси» (19 – начало 20 в.) // Гіст. альманах. 2003. Т. 9. С. 44–47.
30. *Каханоўскі А. Г.* Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861–1914 гг.). Мінск, 2013.
31. *Каханоўскі А. Г.* Шляхі сацыяльнай мабільнасці насельніцтва Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. // Працы гістарычнага факультэта БДУ : навук. зб. / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. Мінск, 2010. Вып. 5. С. 48–56.
32. *Каханоўскі А. Г.* Міжсаслоўная сацыяльная мабільнасць насельніцтва Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. // Российские и славянские исследования : науч. сб. / редкол.: А. П. Сальков, О. А. Яновский (отв. ред.) [и др.]. Минск, 2012. Вып. 7. С. 80–91.
33. *Макарэвіч В. С.* «Панскі разбор шляхты»: абеззямельванне чыншавікоў у другой палове XIX ст. і чыншавая рэформа 1886 г. у Беларусі // Беларус. гіст. часоп. 2011. № 4. С. 3–14.
34. *Маскевіч Г. І.* Фактары сацыяльнай мабільнасці сялянства Беларусі (60–90-я гг. XIX ст.) // Научные труды Республиканского института высшей школы. Исторические и психолого-педагогические науки : сб. науч. ст. : в 2 ч. / под ред. В. Ф. Беркова. Минск, 2009. Вып. 8 (13), ч. 1. С. 113–120.
35. *Кныш О. В.* Маргинальные группы в белорусском обществе во второй половине XIX в. // Актуальныя праблемы сацыяльнай гісторыі Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.): да 90-годдзя Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. : матэрыялы рэсп. навук.-тэарэт. канф. (Мінск, 23 лют. 2007 г.). Мінск, 2007. С. 116–120.
36. *Токць С.* Беларуская вёска ў эпоху зьменаў: другая палова XIX – першая траціна XX ст. Мінск, 2007.
37. *Яноўская В. В.* Хрысціянская царква ў Беларусі 1863–1914 гг. Мінск, 2002.
38. *Ганчар А. И.* Римско-католический костел в Беларуси (1864–1905 гг.). Гродно, 2008.

Паступіў у рэдакцыю 11.06.2015.

***Аляксандр Генадзьевіч Каханоўскі*** – доктар гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу гістарычнага факультэта БДУ.

*УДК 322(476)*

*В. Д. КРЮКОВСКИЙ*

## ВЗАИМООТНОШЕНИЯ ГОСУДАРСТВА И ЦЕРКВИ В ПРАКТИКЕ РАБОТЫ КОМСОМОЛЬСКИХ ОРГАНИЗАЦИЙ БЕЛАРУСИ В 1970-е гг.

Раскрывается организация работы первичных организаций ЛКСМБ в системе отношений государства и церкви в годы исследуемого периода. Анализируется складывание организационной структуры руководства работой по формированию научно-материалистического мировоззрения молодежи от первичных организаций до ЦК ЛКСМБ. Отмечается сложность этого процесса, низкая эффективность работы создаваемой системы. Указывается, что данным направлением идеологической деятельности нередко занимались недостаточно подготовленные люди из числа комсомольских работников, не способные детально разобраться в сути и сложностях проблем атеистического воспитания. Отмечается, что ликвидация в середине 1980-х гг. еще не сложившейся структуры управления научно-атеистическим воспитанием молодежи решением ЦК ЛКСМБ привела к разобщенности и несогласованности в мировоззренческой работе.

***Ключевые слова:*** организация работы; структура руководства; мировоззрение; религия; воспитание; бюрократизм; формализм.

In the article on the basis of a broad source base the author revealed work organization of primary Lenin Communist Youth Union of Belarus guilds in the church and state system relations of the studied period. In Komsomol guilds of the republic the organizational structure of the work guidance on scientific and materialist youth outlook formation from primary guilds to the Central Committee of Lenin Communist Youth Union of Belarus started forming. This process was complicated, the operating efficiency of the created system was low. This is largely due to the fact that insufficiently prepared people from Komsomol workers, who were not capable to understand the essence and complexity of the problems of atheistic education, dealt with the directions of this ideological activity. In the mid-1980s the non-established management structure of scientific and materialist youth outlook was destroyed by the decision of the Central Committee of Lenin Communist Youth Union of Belarus. Instead of it disunity and inconsistency appeared in ideological work.

***Key words:*** work organization; management structure; ideology; religion; education; bureaucracy; formalism.

В 1950–60-е гг. в системе взаимоотношений государства и церкви в деятельности комсомольских организаций республики, как показывает изучение архивных документов, не было специальных организационных структур, способствующих эффективному решению намеченных задач. Не была налажена работа и по использованию того, пусть небольшого, опыта, который был к тому времени накоплен. Это снижало результативность, научный и методический уровень воспитания, не способствовало совершенствованию его форм и методов. О недостаточной работе комсомола на этом участке мировоззренческой работы говорит и тот факт, что на принятые ЦК КПСС «Мероприятия по усилению атеистического воспитания населения» (1964) и ЦК КПБ «Мероприятия по дальнейшему усилению атеистического воспитания населения республики» [1, л. 35–37] (1964) ЦК ЛКСМБ даже не отреагировал.